ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

Паступіў у рэдакцыю 14.01.2025
https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-2-163-164 Received 14.01.2025

**Т. А. Навагродскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

# КНІГА ПРА СВЯТЫ І ПРА ЛЮДЗЕЙ, ШТО ІХ СВЯТКУЮЦЬ

Кніга вядомага беларускага этнолага, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела народазнаўства ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» Т. І. Кухаронак «Святочны час. Народныя звычаі і павер'і ў аповедах беларусаў», што выйшла у 2024 г. у выдавецтве «Беларуская навука», прысвечана важнай і заўсёды актуальнай для этналагічнай навукі тэме – традыцыйнай каляндарнай абраднасці, якая з'яўляецца неад'емнай часткай народнай культуры беларусаў і ў значнай ступені выяўляе этнічную спецыфіку. Нягледзячы на тое, што ў апошнія гады ў нашай краіне з'явілася нямала публікацый, прысвечаных розным аспектам традыцыйнай культуры беларусаў, гэтая кніга, маючы навукова-папулярную скіраванасць, асвятляе новыя аспекты тэмы і будзе цікавай шырокаму колу чытачоў.

У ёй аўтар прадстаўляе ў першую чаргу аповеды саміх вясковых жыхароў, запісаныя ў апошнія 10–20 гадоў падчас этнаграфічных экспедыцый у розныя рэгіёны Беларусі, аб іх удзеле ў святах народнага календара. Усяго для кнігі адабраны запісы ад 232 інфармантаў з 67 раёнаў усіх абласцей Беларусі. Хочацца асабліва падкрэсліць, што аснову кнігі складаюць уласныя новыя палявыя этнаграфічныя матэрыялы, самакаштоўнасць і навуковая самадастатковасць якіх уяўляюцца бясспрэчнымі. Менавіта палявы матэрыял да нашага часу застаецца асноўным інструментам этналогіі як навуковай дысцыпліны. Прааналізаваныя і сістэматызаваныя аўтарам, яны яскрава асвятляюць побытава-абрадавыя аспекты падрыхтоўкі да свята, эмоцыі, хваляванні, перажыванні падчас чакання свята ў час пастоў, звычаі і павер'і, рэальныя жыццёвыя гісторыі, звязаныя з ушанаваннем і памінаннем продкаў і інш. З гэтых наратываў добра бачны розныя практыкі і формы ўдзелу ў святах, што вар'іруюцца ад забароны на гаспадарчую працу да святкавання ўсёй вёскай.

Даследчыца на працягу ўсёй працы з вялікай павагай і любоўю адносіцца да сваіх носьбітаў каштоўнай інфармацыі, якія на аснове глыбокага жыццёвага вопыту дзеляцца сваімі ўласнымі гісторыямі. «А яшчэ асабіста я вучылася ў нашых суразмоўцаў жыццёвай мудрасці, народнай філасофіі, уменню жыць у суладдзі з сабой і навакольным светам – адухоўленым і неадухоўленым, спасцігала глыбока ўкаранёны ў свядомасці і падсвядомасці беларусаў жыццялад. Гэтай кнігай, дзе найперш гучыць "голас" носьбітаў традыцый, мне хочацца сказаць усім нашым інфармантам вялікі дзякуй», – адзначае Т. І. Кухаронак ва ўводзінах. Прысвячае яна гэтую кнігу менавіта сваім самым галоўным у жыцці інфармантам – сваім бацькам, якія першымі на падставе ўласнага прыкладу прывілі любоў і павагу да роднай спадчыны.

Дзякуючы прадуманай падачы палявых матэрыялаў, Т. І. Кухаронак удалося паказаць, як праходзілі святы ў беларускай вёсцы ў 50–80-х гг. ХХ ст. у розных кантэкстуальных сітуацыях і разнастайнасці іх жыццёвых праяў. Упершыню запісаныя аўтарам наратывы даюць уяўленне аб практыцы святкавання ў савецкі перыяд у сувязі з афіцыйным ідэалагічным дыскурсам і на ўзроўні святочных рытуальна-абрадавых паводзін у сям'і і ў вясковай лакальнай супольнасці.

Аўтарскі тэкст арганічна дапаўняе расказы і ўспаміны інфармантаў, што ў сукупнасці дае поўную характарыстыку традыцыйных каляндарных святаў, звычаяў, павер'яў і абрадаў беларусаў у рэгіянальнай разнастайнасці. Аўтару ўдалося пераканаўча паказаць, што ў народным укладзе жыцця беларусаў, як і многіх іншых народаў, кожнае значнае каляндарнае свята было не проста адпачынкам ад працоўных будняў, але падводзіла вынік пэўнага перыяду і адначасова было падрыхтоўкай на будучае.

Рэцэнзуемая кніга паспрыяе папулярызацыі сярод сучасных беларусаў традыцыйных народных каляндарных святаў, звычаяў, абрадаў, знаёмству з іх рэальным функцыянаваннем у сям'і і вясковай супольнасці, дапаможа наблізіцца да адчування той шчырай і сапраўднай радасці, што перажывалі дзеці, молодзь, дарослыя ў перадсвяточныя і святочныя дні, зразумець, як адбывалася перажыванне сакральнага. Кніга зроблена з глыбокай павагай да носьбітаў традыцыі, захавальнікаў лепшых узораў вусна-паэтычнай творчасці, народнага мастацтва беларусаў. Яна багата ілюстравана фотаздымкамі, што значна аблягчае ўспрыманне тэкставага матэрыялу.

Няма сумненняў, што манаграфія Т. І. Кухаронак будзе з належнай увагай сустрэта і высока ацэнена як навуковай супольнасцю, так і зацікаўленымі чытачамі нашай краіны. Яе матэрыялы і высновы папоўняць скарбніцу беларускай духоўнай культуры, а таксама будуць запатрабаваны установамі і арганізацыямі культуры ў практычнай дзейнасці па адраджэнні святочнаабрадавых традыцый нашых продкаў.


## Информация об авторе

**Новогродский Тадеуш Антонович** – доктор исторических наук, профессор, профессор кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета. Белорусский государственный университет (ул. Красноармейская, 6, 220036, Минск, Республика Беларусь). E-mail: tadeush_minsk@mail.ru

## Information about the author

**Tadeush A. Novogrodsky** – D. Sc. (Hist.), Professor, Professor of the Department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history of the Belarusian State University (6 Krasnoarmeiskaya Str., Minsk 220036, Belarus). E-mail: tadeush_minsk@mail.ru